***«Наймальнік пастаянна затрымлівае выплату заработнай платы, куды звярнуцца?»***

У адпаведнасці з пунктам 4 часткі 1 артыкула 55 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей – ПК) наймальнік абавязаны выдаваць заработную плату ў тэрміны і памерах, устаноўленых заканадаўствам, калектыўным дагаворам, пагадненнем або працоўным дагаворам, але не радзей двух разоў у месяц (артыкул 73 ПК), а ў выпадку заключэння кантракту – не радзей аднаго разу ў месяц (частка 1 пункта 4 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.07.1999 № 29 «Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны»), калі іншая перыядычнасць выплаты заработнай платы не ўстаноўлены калектыўным дагаворам.

Пры несвоечасовай выплаце заработнай платы, якая выявілася ў затрымцы выплаты на адзін каляндарны месяц і больш у параўнанні з устаноўленым тэрмінам, яна павінна быць наймальнікам праіндэксаваная (артыкул 58 ПК, пункт 3 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30.08.1996 № 344 «Аб своечасовай выплаце заработнай платы, пенсій, стыпендый і дапамог», пункт 12 Інструкцыі аб парадку і ўмовах індэксацыі грашовых даходаў насельніцтва ў сувязі з інфляцыяй, а таксама пры несвоечасовай выплаце заработнай платы, пенсій, стыпендый і дапамог, зацверджанай пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 05.05.2009 № 57).

Калі зарплата работніку не выплачана або выплачана з парушэннем тэрмінаў, работнік мае права паведаміць аб гэтым у тэрытарыяльнае падраздзяленне Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы, размешчанае ў межах той адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, на тэрыторыі якой паўстала дадзенае пытанне, альбо звярнуцца з іскавай заявай у суд па месцы рэгістрацыі арганізацыі.

Вяржынская Таццяна,
галоўны дзяржаўны інспектар
Смаргонскага міжраённага аддзела
Гродзенскага абласнога ўпраўлення
Дэпартамента дзяржаўнай
інспекцыі працы